# «СЯМ'Я – УСЯМУ АСНОВА»

Так называлася мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню сям'яў, якое праходзіла ў сярэдзіне мая ў Інтэрнаце № 6.

Сям'я – адно з галоўных слоў у жыцці кожнага чалавека. Сям'я – гэта блізкія і родныя людзі, тыя, каго мы любім, з каго бяром прыклад, пра каго клапоцімся, каму жадаем шчасця і дабра. Менавіта ў іх мы вучымся адказнасці, павазе да іншых, узаемаразуменню.

Таму падчас імпрэзы на пытанне вядоўцы, што такое сям'я, хлопцы і дзяўчаты адказвалі па-рознаму: род, клапатлівасць, пяшчота, любоў і інш. А педагог-арганізатар інтэрната Галіна Аляксандраўна Франц абагульніла: «Усё і ўсе разам».

Затым студэнтаў чакалі конкурсы, якія паказалі, наколькі добра яны ведаюць сваяцкія адносіны, ці шмат казак, прыказак і прымавак пра сямейныя стасункі памятаюць і хто з гульцоў з'яўляецца самым хуткім.

Адным з найцікавейшых момантаў мерапрыемства стала размова з кіраўніком сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы нашага ўніверсітэта Таццянай Аляксандраўнай Кукінай. Яна прапанавала хлопцам і дзяўчатам на прыкладзе тыповых жыццёвых сітуацый разабрацца, як лепш паступіць у тых ці іншых абставінах і чаму. Акрамя гэтага ўдзельнікі павінны былі выбраць геаметрычную фігуру, з якой у іх асацыюецца сям'я. Пасля гэтага Таццяна Аляксандраўна патлумачыла, што круг сімвалізуе блізкія, цёплыя, спакойныя, бесканфліктныя адносіны. Квадрат сведчыць пра такія ўзаемаадносіны, калі кожны член сям'і выконвае пэўныя абавязкі, прытрымліваецца канкрэтных правіл, а шматкутнік асацыюецца з вялікай дружнай сям'ёй, дзе адзначаюць усе святы, куды прыходзіць шмат гасцей.

Напрыканцы ўсе прысутныя разам праспявалі песню «Родительский дом». На мой погляд, хлопцы і дзяўчаты атрымалі шмат станоўчых эмоцый і ўражанняў.

**Анастасія АЛЬХІМОВІЧ, студэнтка 1-га курса ФлФ.**



